# ПРОЦІДЗЕЯННЕ КАРУПЦЫЙНЫМ ДЗЕЯННЯМ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ Ў XVIII–XIX стст.

А. Д. Воінава

Навуковы кіраўнік: В. М. Лянцэвіч, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі права, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

У артыкуле прадпрымаецца спроба прааналізаваць сутнасць, прычыны паходжання і формы карупцыйных дзеянняў у структурах органаў улады Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі ў перыяд XVIII–XIX стст. У абедзвюх дзяржавах быў сфарміраваны шэраг заканадаўчых актаў, мэтай якіх было пераадоленне карупцыі. У ходзе аналізу на думку І.У. Вішнеўскай: “...фармуецца высноза аб нізкай эфектыўнасці іх [абедзвюх дзяржаў] уздзеяння на бюракратычны апарат і неабходнасць комплекснага падыходу да вырашэння праблемы карупцыі” [1, с. 109].

У часы існавання Старадытнарускай дзяржавы з’явілася так званае “кармленне” чыноўнікаў. Чыноўнік прывык да той думкі, што ён мае права карміцца за кошт іншага чалавека, а гэты чалавек, у сваю чаргу, павінен служыць чыноўніку. “Кармленне” чыноўнікаў перарасло ў “ліхаімства”, што мела на ўвазе сабой атрыманне службовай асобай судовых органаў дазволеных законам пошлін звыш нормы, устаноўленай у законе [2, с. 231]. Акрамя гэтага існавалі і іншыя формы карупцыі, якія заключаліся ў подкупе чыноўнікаў і дзяржаўных дзеячаў, хабар за выкананне справы, прасоўванне пэўных асоб па кар’ернай лесвіцы па прыкметах братэрства, дружбы, роднасных сувязяў, асаблівых адносін. Але разам з тым улада ўвесь гэты час старалася змагацца з карупцыяй праз сваю заканадаўчую дзейнасць.

У артыкуле аналізуюцца карупцыйныя дзеянні ўладных структур Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі ў XVIII-XIX стст. Названы перыяд з’яўляецца спецыфічным па сваёй сутнасці, таму што аказаў значны ўплыў на палітычнае развіццё Беларусі − ў гэты час адбыўся востры палітычны крызіс у Рэчы Паспалітай, у якую ўваходзіла Вялікае Княства Літоўскае – дзяржаўная спадчына беларусаў. Спецыфіка перыяду заключаецца ў тым, што ў той час праводзіліся рэформы, адбылося прыняцце першай Еўрапейскай канстытуцыі ад 3 мая 1791 года. І падмацоўвалася ўсё гэта разбурэннем Рэчы Паспалітай і яе падзелам паміж суседнімі дзяржавамі. Беларускія землі ў выніку перавандравалі ў Расійскую імперыю.

У Рэчы Паспалітай адсутнічала адзіная сістэма кіравання, гэта прывяло да скажэння шляхецкай дэмакратыі, якая працякала ў выглядзе няўвагі да закона, неэфектыўнасці палітычных інстытутаў. З’явілася анархія, у заняпад прыйшло шляхецкае заканадаўства. У XVIII ст. ў Рэчы Паспалітай пачаўся крызіс, падчас якога праца Вальнага сейма была прыпыненая з-за прынцыпу «liberum veto», прынцып якога дазваляў перарываць любыя паседжанні сейма. На фоне гэтага звычайнай справай стаў подкуп паслоў Вальнага сойма для прыняцця пэўнага

рашэння або для зрыву сойма. І не мела значэння: подкуп паслоў сваёй краіны ці іншай.

У той час як Вальны сойм фактычна перастаў дзейнічаць, з'явіліся мясцовыя і ваяводскія соймікі − органы мясцовага шляхецкага самакіравання. У іх кампетэнцыю траплялі такія абавязкі як: абранне паслоў на Вальны сойм, заслухоўванне і пацверджанае іх справаздачнасці, абмеркаванне спраў мясцовага ўзроўню, запаўненне месцаў у мясцовай адміністрацыі. Рашэнні па такіх пытаннях прымаліся большасцю галасоў і нават тут існаваў подкуп, які ажыццяўляў для таго, каб атрымаць большасць галасоў [3, с. 82]. Найбольш папулярным "відам" карупцыі была купля дзяржаўнай пасады. Тым часам у Рэчы Паспалітай існавала 387 розных афіцыйных званняў і пасад. Для таго, каб стаць уладальнікам вялікай ці малой пасады, не абавязкова было быць адукаваным, разумным, працавітым − на гэта не звярталі ўвагі, такую пасаду можна было купіць за грошы, дастаткова было быць спадчынным шляхцічам, і мець зямельны ўчастак [1, с .110].

Для таго, каб спыніць прыкметныя праявы карупцыі, выкарыстоўваліся нормы Статута 1588 г. Аднак антыкарупцыйная дзейнасць заставалася малаэфектыўнай з-за прычынай недасканаласці прававых сродкаў, адсутнасці сусветнай правапрымяняльнай практыкі, на якую можна было б спаслацца. Усё гэта падмацоўвалася нізкім узроўнем маралі ў шляхецкім грамадстве і адсутнасцю матывацыі да антыкарупцыйных дзеянняў [4, с. 113].

Распрацоўка Канстытуцыі ад 3 траўня 1791 г. у Рэчы Паспалітай адыграла вялікую ролю ў абмежаванні карупцыі. Роля Сената, у які ўваходзілі прадстаўнікі магнацкай алігархіі, заканчвалася на прыняцці рашэнняў Генеральным соймам. Для Сената адводзілася роля "рады старэйшын" і яго пазіцыя не звязвала пры галасаванні палату дэпутатаў − Пасольскую ізбу, якую абіралі на сойміках з прадстаўнікоў мясцовай шляхты. Адбылася поўная адмена права "liberum veto" і абмежаванне магчымасці подкупу дэпутатаў. Барацьбе з карупцыяй садзейнічала кантытуцыйная норма аб кантролі заканадаўчай улады для дзяржаўнай дзейнасці – "Варты закона" і за ўсімі дзяржаўнымі органамі [5, с. 128].

Кажучы інакш: у мэтах захавання дзяржавы Канстытуцыя 3 мая 1791 г. мела магчымасць стаць элементам, які вывеў бы краіну з палітычнага крызісу, або ў іншым выпадку − паменшыў бы ганьбу, выкліканую карупцыяй. Падзелы Рэчы Паспалітай былі абгрунтаваны мэтай абароны рэспубліканскіх свабод і прымірэння варагуючых шляхецкіх груповак суседзямі − Расійскай імперыяй, Прусіяй, Аўстрыяй. Беларускія землі адышлі ў выніку ў склад Расійскай імперыі.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай, які адбыўся 28 мая 1772 г., Кацярына ІІ выдае Наказ "Аб арганізацыі кіравання ў атрыманых ад Польшчы землях". На некаторы час у Беларусі захоўваліся элементы адміністрацыйнай, судовай і прававой аўтаноміі. Наказ імператрыцы абвяшчаў: "Суд и расправа внутренние тех провинций в личных делах имеют производится по их законам и обыкновениям и их языком во всех тех случаях, кои не дотрагиваются до власти нашей" [6, с. 822]. Таму з'явіўся дазвол на прымяненне заканадаўства ВКЛ, а менавіта Статута 1588 г. Гэта прывяло да таго, што заканадаўства не было

стабільным і адсутнічала канкрэтыка ў нормах, паколькі на землях Беларусі дзейнічала як старое беларуска-літоўскае заканадаўства, так і нормы расійскага заканадаўства з часоў праўлення Кацярыны ІІ, Паўла І, Аляксандра І. У такіх умовах цяжка было ўжыцца мясцоваму насельніцтву і лёгка і свабодна адчувала сябе мясцовая і расійская бюракратыя, якая ўбачыла для сябе новыя спосабы папаўнення кішэні.

Існаваў фаварытызм, які толькі падмацоўваў карупцыйную дзейнасць. Непаразуменне і незадаволенасць з боку грамадства выклікала тое, што Кацярына ІІ дарыла сваім фаварытам-хабарнікам землі, дарагія рэчы, прысвойвала ім узнагароды вышэйшых ступеняў. Такім чынам, працягвала існаваць урадлівая глеба для размнажэння карупцыі. Яе праявы, характэрныя для імперыі, толькі дапоўнілі старыя “грахі”, якія засталіся ў спадчыну ад Рэчы Паспалітай [1, с. 112].

Папулярнай справай стаў подкуп суддзяў, якія імкнуліся выконваць працу за найбольшую плату. Падмацоўвала такую практыку адсутнасць самастойнага натарыята, функцыі якога выконвалі суды. Існавалі некаторыя памеры аплаты паслуг: за рэгістрацыю дакумента судовыя чыноўнікі бралі 15 капеек, а для таго, каб прыкласці да яго пячатку – у 10 разоў больш. Неабгрунтавана высокія расцэнкі суправаджаліся судовай валакітай, з-за чаго грамадзяне вымушаны былі пастаянна “мяшацца ў судах”. Была прамая залежнасць паміж колькасцю разгледжаных спраў судовых чыноўнікаў і іх платай, таму яны былі зацікаўлены ў бюракратычнай валакіте. Сенацкі ўказ ад 8 мая 1773 г. устанавіў, што суддзі мясцовых судоў на далучаных беларускіх землях будуць пераведзены на грашовыя выплаты ў адпаведнасці з чыноўніцтвам па расійскіх мерках аб рангах і ў залежнасці ад службы. Суддзі губернскага суда сталі атрымліваць 133 рублі, а раённага − 66 рублёў [7, с. 70].

Карупцыя па спадчыне пераходзіла ад аднаго расійскага манарха да наступнага. Карупцыянераў вылічалі і каралі, аднак нягледзячы на гэта, дадзенае дзеянне працягвала насіць масавы характар − гэта і не дзіўна: да прыкладу, у пачатку ХІХ ст. пры кіраванні дзяржавай Аляксандрам І жалаванне супрацоўніка паліцыі складала ад 28 да 50 рублёў асігнацыямі, пакупальніцкая здольнасць якіх значна адрознівалася ад пакупальніцкай здольнасці сярэбраных рублёў. Кіраўніцтва закрывала вочы на паборы сваіх паліцыянтаў, бо разумела, што на такое жалаванне сям’ю не пракарміць [8, с. 205].

У сярэдзіне ХІХ ст. да крымінальнай адказнасці па абвінавачанні ў карупцыі былі прыгавораны 220 чыноўнікаў дзяржаўнай службы, а ў 1883 − ужо 330. Але было зразумела, што да адказнасці была прыгаворана толькі малая частка карупцыянераў.

У ХІХ − пачатку ХХ ст. праблему карупцыі стала ўздымаць беларуская палітыка-прававая думка. Знакаміты мысляр і рэвалюцыянер Кастусь (Вікенцій Канстанцін) Каліноўскі жорстка крытыкаваў дзяржаўны механізм з яго бескантрольным бюракратычным апаратам. Ён асацыіраваў царскіх чыноўнікаў з саранчой: “Яны ўмеюць так абадраць чалавека, што з іх рук выйдзеш голенькі, як маці нарадзіла” [9, с. 154]. Ён не раіў шукаць мужыкам праўду ў судзе і

суадносіў суд у самадзяржаунай Расіі з “воўчай ямай, дзе не разбіраюць ці за табой праўда ці не, а скрабуць адно як могуць” [10, с. 53]. Прычыну карупцыі ён бачыў у царскім рэжыме, бо лічыў, што цар паказвае, а чыноўнікі і суддзі выконваюць.

Каліноўскі лічыў, што ў Беларусі дзейнічае расійская сістэма кіравання не таму, што ў краіне няма таленавітых людзей, здольных замяніць расійскіх чыноўнікаў, а таму, што царскі рэжым такіх людзей высылае ў Сібір, закрывае ў турмах, а на грошы беларусаў-падаткаплацельшчыкаў прызначае сваіх чыноўнікаў, якія абкрадваюць народ па загадзе цара і па сваім жаданні.

Францішак Багушэвіч таксама крытыкаваў царскую адміністрацыю і судовую сістэму, сваю крытыку ён выклаў у такіх творах, як: “Кепска будзе”, “У астрозе”, “У судзе”, “Як праўду шукаюць” і г.д. Багушэвіч абазначыў прычыну судовай валакіты і карупцыі чыноўнікаў: няроўнасць перад законам і судом людзей рознага сацыяльнага ўзроўню, безабароннасць простага непісьменнага чалавека, немагчымасць супрацьстаяць прававому безграніччу [1, с. 113].

Расійская ўлада бачыла праблемы карупцыі і спрабавала спраўляцца з імі. І. У. Вішнеўская дала свой аналіз на антыкаруцыйную палітыку, у тым ліку заканатворчую і правапрымяняльную, якая праводзілася ў канцы XVIII–XIX ст [1, с. 114]. Да сярэдзіны XVIII ст. антыкарупцыйная палітыка адначасова ажыццяўлялася праз тры віды дзейнасці: папераджальную, карную і правааднаўленчую. Такі падыход дазваляў трымаць карупцыю на сацыяльна прымальным узроўні. Але ўжо Кацярына II імкнулася зменшыць негатыўныя наступствы барацьбы з карупцыяй для сваіх набліжаных. Карная дзейнасць пачала памяншацца, а папераджальная і праваадначаўленчая набылі пераважнае развіццё. Распрацавалася сістэма знешне прывабных праваадначаўленчых мер, напрыклад, унясенне карупцыянерам падвойнага памеру матэрыяльных сродкаў, атрыманых у выніку подкупу [11, с. 244]. Але на справе адмова ад крымінальнай адказнасці за хабарніцтва толькі павысіла цікавасць дзяржаўнай службы для патэнцыйных карупцыянераў.

Выкараніць карупцыю спрабавалі і ў часы праўлення Аляксандра I. Так у 1802 г. цар выдае Указ “Общему собранию правительствующего Сената об изыскании причин и представлении средств к искоренению лихаимства и лихадательства”, на падставе якога на працягу 20 гадоў вялася праца па аналізе існуючых і папярэдніх норм заканадаўства аб карупцыі ў пошуку эфектыўных норм. У выніку былі выяўлены некаторыя нормы мінулых гадоў, прызнаныя эфектыўнымі, напрыклад, норма пятроўскага заканадаўства аб роўнай крымінальнай адказнасці тых, хто дае хабар і тых, хто яго бярэ.

Важным ўдасканаленнем заканадаўства аб адмове ад хабарніцтва было выданне, здзейсненае калектывам II аддзялення Асобай канцэлярыі пад кіраўніцтвам М. Сперанскага, “Звода законаў” (1832), у якім хабарніцтву была адведзена частка 6 раздзела 5. У дадзеным выданні пералічваюцца віды хабарніцтва і незаконных збораў пад выглядам дзяржаўных падаткаў, вымагальніцтва грошай або маёмасных рэчаў у якасці падарункаў, хабары па судовых і выканаўчых справах. Перадача ўзнагароды за дзеянне законнае па

служебных абавязках называлася мздаімствам, а калі передача хабару меркавала парушэнне службовых абавязкоў, то гаворка ішла аб ліхаімстве. За мздаімства прадугледжвалася грашовае пакаранне і часам зрушэнне з пасады, а за ліхаімства заканадаўства ўстанаўлівала больш жорсткія меры: зняволенне і выпраўленчыя работы.

Існавала III аддзяленне Асобай канцылярыі яго імператарскай вялікасці, створанае ў 1826 г. па ўказе Мікалая I. Галоўнай функцыяй III аддзялення быў палітычны вышук, але і функцыі агульнага кантролю за органамі дзяржаўнага кіравання яно гэтак жа выконвала. Вынікі сістэматычнага дагляду замацоўваліся ў штогадовых справаздачах. У “Справаздачы аб дзейнасці міністэрства ўнутраных спраў з 1840 г.” адзначалася, што да кіравання дапускаюцца “нягодныя” асобы, адсутнічае кантроль з боку міністэрства за дзеяннямі губернскіх і павятовых органаў кіравання.

Публікаванне інфармацыі аб маёмасным становішчы чыноўнікаў імперыі было важным фактарам барацьбы з карупцыяй. Дадзеная мадэль барацьбы адносіцца да часоў кіравання Аляксандрам II (1855–1881 гг.). Выдаваліся перыядычна кнігі пад назвай “Спіс грамадзянскіх чыноў якога-небудзь ведамства”. У кнізе змяшчалася інфармацыя аб службе чыноўніка і аб яго ўзнагароджаннях, спагнаннях. Кожны мог бачыць наяўнасць маёмасці, як за чыноўнікам, так і “за яго жонкай”, і суаднесці рэальнае матэрыяльнае становішча з тым, што ён заявіў [1, с. 114].

У 1866 г. прымаецца “Улажэнне аб пакараннях крымінальных і папраўчых” (наступная рэдакцыя – ў 1885 г.). У дакуменце прадугледжвалася, што злачынства завершана, калі грошы ці рэчы толькі абяцаныя перадаюцца на супрацоўніцтва. Адзначаліся таксама і завуаляваныя спосабы атрымання хабару − пад выглядам проігрыша, продажу, мены або іншай здзелкі [12, с. 67]. Калі падарунак быў прыняты пасля выканання абяцанага дзеяння, то чыноўнік плаціў спагнанне ў падвойным памеры платы падарунку, а калі падарунак прымаўся перад выкананнем абяцання, то хабарніка, акрамя выплаты штрафу здымалі з пасады (арт. 372) [13, с. 47]. Вышэйшай ступенню ліхаімства “Улажэнне” прадугледжвала вымаганне, за яго інаваты страчваў свабоду на тэрмін ад 5 да 6 гадоў (арт. 378) [13, с. 48].

Зробім выснову аб тым, што галоўныя прычыны распаўсюджвання карупцыйных дзеянняў на тэрыторыі Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі заключаліся ў нізкім адукацыйным узроўні чыноўнікаў, адсутнасці строгага падыходу да закона і кантролю за дзейнасцю органаў дзяржаўнага кіравання, дрэнным матэрыяльным забеспячэнні некаторых груп чыноўнікаў, прыняцці недастатковых мер для барацьбы з карупцыяй. Нават нягледзячы на такую дастатковую колькасць актаў, выдадзеных для пераадолення карупцыі, дадзенае злачыннае дзеянне ўсё ж працягвала існаваць і шукала свае хітрыкі для ўхілення ад адказнасці.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**


1. Вішнеўская, І. У. Заканадаўства XVIII–XIX стст. па супрацьдзеянні карупцыі на тэрыторыі Беларусі / І. У. Вішнеўская // Проблемы управления. – 2021. – № 3(81). – С. 109–116.
2. Гридякин, Д. А. Коррупция в государственном механизме современной России / Д. А. Гридякин // Научные ведомости. – 2009. – № 7(62). – С. 230–235.
3. Звонарёва, О. С. Власть и право (цивилизационно-культурный анализ) / О. С. Звонарёва. – Минск : Бел. наука, 2006. – 93 с.
4. Вішнеўская, І. У. Карупцыя ў кантэксце палітыка-прававой думкі і заканадаўства Вялікага Княства Літоўскага (XV–XVI стст.) / І. У. Вішнеўская // Проблемы управления. – 2020. – № 2(76). – С. 112–119.
5. Гісторыя канстытуцыйнага права Беларусі / Р. А. Васілевіч, Т. І. Доўнар, І. А. Юхо. – Мінск : ВТАА "Права і эканоміка", 2001. – 363 с.
6. Законодательство Екатерины II : в 2 т. / отв. ред. О. И. Читяков, Т. Е. Новицкая. – М. : Юрид. лит., 2000. – Т. 1. – 1056 с.
7. Анішчанка, Я. Беларусь ў часы Кацярыны II (1772–1796) / Я. Анішчанка. – Мінск : Веды, 998. – 211 с.
8. Ерошкин, Н. П. История государственных учреждений дореволюционной Росиии / Н. П. Ерошкин. – 3-е изд. – М. : Высш. шк., 1983. – 352 с.
9. Шалькевич, В. Ф. Кастусь Калиновский: страницы биографии / В. Ф. Шалькевич. – Минск : Университетское, 1988. – 240 с.
10. Калиновский, К. Из печатного и рукописного наследия / К. Калиновский. – Минск : Беларусь, 1988. – 208 с.
11. Танков, А. А. К истории взятоничества / А. А. Танков // Исторический Весник. – 1888. – № 10. – С. 238–245.
12. Волженкин, Б. В. Ответственность за взятоничество по российскому уголовному законодательству второй половины XIX– нач. XX вв. / Б. В. Волженкин // Правоведение. – 1991. – № 2. – С. 60–68.
13. Уложение о наказаниях уголовных и исправительных : издание 1885 г. / Свод законов Российской империи : изд. неофициальное : в 16 т. – СПб. : Деятель, 1912. – Т. 15. – С. 1–202.